# АЛЕГУ ТРУСАВУ - 55



**ТРУСАЎ Алег Анатолевіч** нарадзіўся 7 жніўня 1954 годе ў горадзе Мсціславе Магілёўскай вобласці. У 1976 годзе скончыў гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэта. У перыяд з 1976 па 1992 гады працаваў у Беларускім рэстаўрацыйным праектным інстытуце. У 1981 годзе абараніў кандыдацкую дысертацыю.

З 1996 да сакавіка 1998 году — дэкан факультэта бібліятэчна-інфармацыйных сістэмаў Беларускага універсітэта культуры. Цяпер дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства.

У чэрвені 1989 году на Ўстаноўчым з'езде БНФ быў абраны ў склад першага Сойму БНФ. Прымаў удзел у абвяшчэнні дзяржаўнага суверэнітэту і поўнай незалежнасці Рэспублікі Беларусь, адзін з распрацоўшчыкаў афіцыйнай выявы дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь «Пагоня», бел-чырвона-белага дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь і наверша да яго.

У 1990—1996 — дэпутат Вярхоўнага Савету XII склікання. З 1990 па 1995 гады — намеснік старшыні камісіі Вярхоўнага Савету Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры і ахове гістарычнай спадчыны.

У 1989 годзе Трусаў выступіў адным з заснавальнікаў Таварыства беларускай мовы. У красавіку 1997 году абраны Рэспубліканскай Радай першым намеснікам старшыні ТБМ. На VI з'ездзе ТБМ 17 красавіка 1999 году абраны старшынём Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны, якім кіруе дасюль.

Сябры і паплечнікі шчыра віншуюць Алега Анатолевіча з днём народзінаў і зычаць яму імпэту і плёну ў далейшым змаганні за Беларусь.

*(Пра Алега Трусава чытайце на ст. 2.)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

